NATO OTAN

# Адкрый для сябе НАТО

БОЛЬШ ІНФАРМАЦЫІ
на нашым сайце:
www.nato.int



## Абарона людзей

Часта мы як належнае ўспрымаем тое, што можам свабодна жыць у бяспечным і эканамічна стабільным асяроддзі. Галоўным элементам нашага дабрабыту з'яўляецца бяспека ва ўсіх галінах штодзённага жыцця.

## Барацьба з новымі пагрозамі

Са зменай характару пагроз мусяць мяняцца і метады захавання міра. НАТА пераарыентуе свае абарончыя магчымасці ў адпаведнасці з цяперашнімі пагрозамі. Арганізацыя адаптуе ўзброеныя сілы і развівае шматнацыянальныя падыходы да барацьбы супраць тэрарызма, дачыненняў з дзяржавамі, палітычная і сацыяльная абстаноўка ў якіх вельмі нестабільная, і іншых пагроз бяспецы, такіх, як зброя масавага знішчэння.

## Стварэнне партнёрства

Наладжванне дыялога і супрацоўніцтва - надзвычай важная справа для мірных зносін і больш глыбокага паразумення на міжнародным узроўні.

НАТА дае краінам-членам і краінам-партнёрам унікальную магчымасць для кансультацый па пытаннях бяспекі, што спрыяе даверу, а ў перспектыве дапамагае пазбягаць канфліктаў.

Шляхам практычнага супрацоўніцтва і шматбаковых ініцыятываў краіны разам супрацьстаяць новым пагрозам бяспецы.

## Пабудова міру і стабільнасці

Выгодамі стабільнасці могуць адначасова карыстацца многія бакі. Вырашальна важна прынесці стабільнасць у рэгіёны, дзе напружанне нясе пагрозу бяспецы. Вось чаму НАТА ў супрацоўніцтве з іншымі міжнароднымі арганізацыямі іграе актыўную ролю ў аперацыях па ўрэгуляванні крызісаў.

## Краіны-члены і краіны-партнёры

Падпісанне Паўночнаатлантычнага Дагавору 4 красавіка 1949 г.

### КРАІНЫ-ЧЛЕНЫ (+ ДАТА ЎВАХОДЖАННЯ)

- Албанія /2009
- Бельгія /1949
- Балгарыя /2004
- Канада /1949
- Харватыя /2009
- Чэская Рэспубліка /1999
- Данія /1949
- Эстонія /2004
- Францыя /1949
- Нямеччына /1955
- Грэцыя /1952
- Венгрыя /1999
- Ісландыя /1949
- Італія /1949
- Латвія /2004
- Літва /2004
- Люксембург /1949
- Нідэрланды /1949
- Нарвегія /1949
- Польшча /1999
- Партугалія /1949
- Румынія /2004
- Славакія /2004
- Славенія /2004
- Іспанія /1982
- Турцыя /1952
- Аб'яднанае Каралеўства /1949
- Злучаныя Штаты /1949

### КРАІНЫ "ПАРТНЁРСТВА ДЗЕЛЯ МІРУ" (ПДМ)

- Арменія
- Аўстрыя
- Азербайджан
- Беларусь
- Боснія і Герцагавіна
- Фінляндыя
- Грузія
- Ірландыя
- Казахстан
- Кіргізія
- Малдова
- Мальта
- Чарнагорыя
- Расія
- Сербія
- Швецыя
- Швейцарыя
- Таджыкістан
- былая Югаслаўская Рэспубліка Македонія*
- Туркменістан
- Украіна
- Узбекістан

### ПАРТНЁРЫ ПА МІЖЗЕМНАМОРСКІМ ДЫЯЛОГУ

- Алжыр
- Егіпет
- Ізраіль
- Іарданія
- Маўрытанія
- Марока
- Туніс

### КРАІНЫ СТАМБУЛЬСКАЙ ІНІЦЫЯТЫВЫ СУПРАЦОЎНІЦТВА (СІС)

- Бахрэйн
- Кувейт
- Катар
- Аб'яднаныя Арабскія Эміраты

*Турцыя прызнае Рэспубліку Македонію пад яе канстытуцыйнай назвай.

brochureOTAN_BEL.indd 1 1/06/10 11:34




# Што такое НАТА?

Арганізацыя Паўночнаатлантычнага дагавору з’яўляецца адной з найбольш уплывовых міжнародных арганізацый у свеце. Гэта палітычны і ваенны саюз, які аб’ядноўвае 28 краін-членаў з Еўропы і Паўночнай Амерыкі.

Гэтыя краіны сустракаюцца для супрацоўніцтва ў галіне бяспекі і абароны. З гэтага пункту гледжання НАТА ўяўляе сабою ўнікальнае аб’яднальнае звяно паміж гэтымі двума кантынентамі па пытаннях супрацоўніцтва ў палітыцы і бяспецы.

## Чым займаецца НАТА?



НАТА лічыць сваім абавязкам абарону ўласных членаў палітычнымі і ваеннымі сродкамі. Арганізацыя таксама спрыяе кансультацыям і супрацоўніцтву з краінамі, што не з’яўляюцца членамі НАТА, па шырокім коле пытанняў бяспекі, такім, як рэформа абароны і захаванне міра.

Праз гэтыя абмеркаванні і партнёрскія сувязі НАТА робіць уклад у прадухіленне канфліктаў як у межах краін-членаў, так і па-за іх межамі.

Арганізацыя прапагандуе дэмакратычныя каштоўнасці і цвёрда трымаецца мірнага шляху вырашэння спрэчак. Калі дыпламатычныя спробы не прыносяць поспеху, арганізацыя мае неабходныя ваенныя сродкі для ўрэгулявання крызісаў і міратворчых аперацый, якія можа прадпрымаць як самастойна, так і ў супрацоўніцтве з іншымі краінамі і міжнароднымі арганізацыямі.

НАТА мае таксама трэцяе вымярэнне, якое складаецца з дзейнасці ў сферы надзвычайнага грамадзянскага планавання, што дапамагае саюзнікам і партнёрам пераадольваць наступствы катастроф, а таксама прапагандаваць супрацоўніцтва ў галіне навукі і аховы навакольнага асяроддзя.

## Якім чынам дзейнічае НАТА?

Кожная краіна-член арганізацыі мае пастаянную дэлегацыю ў палітычнай штаб-кватэры НАТА ў Брусэлі. На яе чале стаіць пасол, які прадстаўляе свой урад у працэсе кансультацый і прыняцці Саюзам рашэнняў.

Паўночнаатлантычны Савет з’яўляецца ў структуры Арганізацыі найбольш важным палітычным органам з тых, што выпрацоўваюць рашэнні. Яна збіраецца на розных узроўнях, а на яе чале стаіць Генеральны сакратар НАТА, які дапамагае членам прысці да згоды па найважнейшых пытаннях. Усе рашэнні ў кожным з камітэтаў НАТА прымаюцца на падставе кансэнсуса. Такім чынам “рашэнне НАТА” – гэта выраз калектыўнае волі ўсіх краін-членаў.

НАТА мае вельмі няшмат уласных пастаянных узброенных сіл. Калі на аперацыю маецца згода Паўночнаатлантычнага Савета, краіны-члены пасылаюць на гэтую аперацыю свае войскі на дабраахвотнай аснове. Як толькі місія завершаная, гэтыя ўзброеныя сілы вяртаюцца ў свае краіны.

Каардынацыяй і правядзеннем гэтых аперацый займаецца структура ваеннага камандавання. Гэтая структура складаецца са штаб-кватэры і базаў, што знаходзяцца ў розных краінах-членах.

Штодзённая дзейнасць НАТА, грамадзянскія і ваенныя структуры Арганізацыі і праграмы інвеставання ў бяспеку фінансуюцца праз агульныя бюджэты, якія ствараюцца ўрадамі краін-членаў па ўзгодненай формуле размеркавання выдаткаў.



© NATO 2010 - BEL